# ПУНКТУАЦЫЙНЫЯ НОРМЫ: ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў БЯЗЗЛУЧНІКАВЫХ СКЛАДАНЫХ СКАЗАХ. 11 КЛАС

**Брытанава Сняжана Мікалаеўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА "Суражская сярэдняя школа
імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова"

***Родная мова – найлепшы спосаб разумець адзін аднаго!***

*Урок праводзіцца ў 11 класе (павышаны ўзровень) пасля вывучэння тэмы "Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах". На занятку вучні замацоўваюць і сістэматызуюць набытыя веды. Заданні, што выконваюцца на ўроку, садзейнічаюць фарміраванню ўмення правільна ставіць і тлумачыць знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах, складаць і перабудоўваць бяззлучнікавыя складаныя сказы; спрыяюць удасканаленню камунікатыўных уменняў вучняў. Адзінаццацікласнікі актуалізуюць тэарэтычныя звесткі, а потым прымяняюць набытыя веды на практыцы. На ўроку выкарыстаны тэкстацэнтрычны падыход: праца з тэкстам. Арганізуецца работа з высокаматываванымі вучнямі, для іх прапануюцца творчыя заданні. Праводзіцца гульня "Трэцяе лішняе". Мае месца дынамічная (тэматычная) паўза. З дапамогай пытанняў падводзяцца вынікі ўрока. У канцы занятку навучэнцы ацэньваюць сваю працу і настрой.*

**Тэма:** Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах.

**Мэта:** да заканчэння ўрока вучні павінны замацаваць і сістэматызаваць веды па тэме "Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах".

**Задачы:** садзейнічаць фарміраванню ўмення правільна ставіць і тлумачыць знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах, складаць і перабудоўваць бяззлучнікавыя складаныя сказы; спрыяць удасканаленню камунікатыўных уменняў; развіваць звязнае маўленне, памяць і мысленне; садзейнічаць выхаванню цікавасці да вывучэння беларускай мовы.

**Абсталяванне:** асабістыя карткі заданняў у вучняў, ТСН.

**Тып урока:** падагульненне і сістэматызацыя вывучанага.

**Элементы выкарыстаных тэхналогій:** гульнёвая, развіццё крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, узроўневая дыферэнцыяцыя, ІКТ, візуалізацыя.

**Формы навучання:** франтальная, індывідуальная, работа ў парах і групах.

**Метады:** славесны, рэпрадуктыўны, праблемна-пошукавы, метад самастойнай работы.

**Этапы ўрока:**

***1. Арганізацыйна-матывацыйны этап***

– Добрай раніцы, мае шаноўныя вучні! Пачынаем наш урок. Павярніцеся адзін да аднаго, паглядзіце адзін аднаму ў вочы, прыемна ўсміхніцеся, падарыце адзін аднаму і мне сваю ўсмешку. Няхай сённяшні ўрок прынясе вам усім радасць зносін!

***2. Вызначэнне тэмы і задач урока***

– На працягу некалькіх апошніх урокаў мы з вамі гаварылі пра складаныя сказы, а дакладней, пра адзін з відаў складаных сказаў. Давайце прыгадаем, якія віды складаных сказаў існуюць. Значыць, сёння мы павінны замацаваць і прывесці ў сістэму набытыя веды пра бяззлучнікавыя складаныя сказы. Звярніце ўвагу на схему, змешчаную на слайдзе.




– Давайце яе агучым. Значыць, якая тэма нашага ўрока?

(Вучні самі вызначаюць задачы ўрока, а настаўнік запісвае іх на дошцы.)

На дошцы:

*Будзем ведаць:*

*Будзем умець:*

– У вас на сталах у кожнага ёсць ліст кантролю. У яго вы будзеце ўносіць адзнакі за работу на ўроку. Зараз кожны з вас паставіць у лісце адзнаку, якую вы плануеце атрымаць за ўрок. У канцы ўрока вы выставіце сабе адзнаку і паглядзіце, ці супалі вашы адзнакі.

Ліст кантролю

Прозвішча,
імя вучня________________________________

Адзнака,
якую плануеце атрымаць за ўрок___________

| № п/п | Заданне | Максімальны бал | Набраны бал |
|---|---|---|---|
| 1 | Лічбавы дыктант | 10 б. (1 правільны адказ – 1 бал) | |
| 2 | Праца з тэкстам | 9 б. (3 балы за 1 сказ, 3 сказы – 9 балаў) | |
| 3 | Тэставая работа | 10 б. (1 правільны адказ – 1 бал) | |
| | Усяго: | 10 б. | |

Адзнака,
якую атрымалі за ўрок_______________

***3. Праверка дамашняга задання***

– Вам неабходна было напісаць эсэ на тэму “Праблема вольнага часу ў нашы дні”, ужываючы бяззлучнікавыя складаныя сказы.

***4. Замацаванне матэрыялу па тэме “Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах”***

Запіс даты і тэмы ўрока ў сшытак.

1. ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЧАСТКА

– Зараз мы ўзгадаем тэарэтычныя звесткі па тэме (Вучні паўтаралі дома тэарэтычны матэрыял па тэме “Бяззлучнікавыя сказы”).

Лічбавы дыктант: калі згодны (згодна) – 1, не – 0.

1. Складаны бяззлучнікавы сказ – гэта сказ, у якім часткі звязваюцца сэнсава і інтанацыйна, без злучнікаў і злучальных слоў (1).

2. Схема бяззлучнікавага складанага сказа можа ўтрымліваць круглыя дужкі (0).

3. Бяззлучнікавы складаны сказ з аднатыпнымі часткамі можна перабудаваць у складаназлучаны сказ (1).

4. Паміж разнатыпнымі часткамі бяззлучнікавага сказа выражаюцца прычынныя, умоўныя, дапаўняльныя адносіны (1).

5. Найчасцей паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца кропка з коскай (0).

6. Кропка з коскай ставіцца паміж часткамі бяззлучнікавага сказа, калі часткі маюць ускладненую будову і свае знакі прыпынку (1).

7. Калі паміж часткамі бяззлучнікавага сказа можна ўставіць злучнік *таму што, бо,* то ставіцца двукроп’е (1).

8. Калі паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа можна ўставіць *а іменна,* то ставіцца працяжнік (0).

9. Калі часткі бяззлучнікавага сказа паказваюць на хуткую змену падзей або другая частка паказвае на вынік, то ставіцца працяжнік (1).

10. Калі другая частка бяззлучнікавага складанага сказа выражае прамое пытанне, то ставіцца двукроп’е (1).

Абмен сшыткамі (узаемаправерка). Вучні ў ролі настаўнікаў. Адказы запісаны на дошцы.

Калі адказы супадаюць, ставім “+”, не – “–”. Падлічыце колькасць плюсаў, выстаўце бал за работу ў ліст кантролю.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1-1 | 2-0 | 3-0 | 4-1 | 5-0 | 6-1 | 7-1 | 8-0 | 9-1 | 10-1 |

2. ПРАКТЫЧНАЯ ЧАСТКА

По дарозе ў атрад

Яны ішлі надта марудна. Рыбак адчуваў: неўзабаве пачнецца світанак. Застане ранак іх сярод поля – ужо, відаць, не выкруціцца. Яму ўвесь час карцела ісці шпарчэй, але Сотнікаў марудна пераставўляў ногі, часта спыняўся. Увогуле іх ратавала тая акалічнасць, што снег быў неглыбокі, і Рыбак стараўся ісці па ім. Але іх след надта выразна азначаўся на касагорыне. Убачыўшы яго, Рыбак ажно жахнуўся: вельмі проста было дагнаць іх цяпер, нават уночы.

Паводле В. Быкава

1. Праца з тэкстам.

Па дарозе ў атрад

Яны ішлі надта марудна. Рыбак адчуваў неўзабаве пачнецца світанак. Застане ранак іх сярод поля  ужо відаць не выкруціцца. Яму ўвесь час карцела ісці шпарчэй але Сотнікаў марудна пераставўляў ногі часта спыняўся. Увогуле іх ратавала тая акалічнасць што снег быў неглыбокі і Рыбак стараўся ісці па ім. Але іх след надта выразна азначаўся на касагорыне. Убачыўшы яго Рыбак ажно жахнуўся вельмі проста было дагнаць іх цяпер, нават уночы.

Паводле В. Быкава

– Давайце прачытаем уважліва тэкст услых.

– Ці знаёмы вам гэты  тэкст? Назавіце аўтара і назву твора.

– Вызначце стыль і тып тэксту.

– Знайдзіце і выпішыце з тэксту бяззлучнікавыя складаныя сказы, пастаўце правільна і растлумачце знакі прыпынку, пабудуйце схемы.

Вучні запісваюць схемы на дошцы.

– Выстаўце бал за работу ў ліст кантролю. 3 балы за адзін правільна выпісаны сказ, у якім правільна пастаўлены знак прыпынку і правільна зроблена схема. Усяго 3 сказы. Такім чынам, можна атрымаць 9 балаў.

2. Праца са сказамі і схемамі да іх (праца ў парах). На картцы дадзены 3 схемы складаных бяззлучнікавых сказаў і 6 сказаў. Неабходна размеркаваць сказы ў адпаведнасці са схемамі.

1. [ ], [ ].
2. [ ] : [ ].
3. [ ] – [ ].

*1. На паплавах ходзіць цыбаты бусел недзе ў затоках сонна крэкчуць жабы.*

*2. Ёсць раніца павінен быць і вечар.*

*3. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку маломў кліча яго рэчка цягнуць санкі з дому.*

*4. Клікнуць хацелася голас замёр.*

*5. Заглянуць у вокны ніхто не мог шыбы пакрыліся тоўстым пластом намаразі.*

*6. Замерлі дрэў макушкі не зварухнецца ліст.*

Адказы:

*1. На паплавах ходзіць цыбаты бусел, недзе ў затоках сонна крэкчуць жабы.*

*2. Ёсць раніца – павінен быць і вечар.*

*3. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку маломў: кліча яго рэчка, цягнуць санкі з дому.*

*4. Клікнуць хацелася – голас замёр.*

*5. Заглянуць у вокны ніхто не мог: шыбы пакрыліся тоўстым пластом намаразі.*

*6. Замерлі дрэў макушкі, не зварухнецца ліст.*

1 схема – 1 і 6 сказы; 2 схема – 3 і 5 сказы; 3 схема – 2 і 4 сказы.

3. Гульня "Трэцяе лішняе"

1. Бо, а іменна, і.
2. [ ] : [ ], [ ] – ( ), [ ] ; [ ].
3. Злучнік, сэнс, інтанацыя.

**Дынамічная паўза**

– Зараз мы крыху адпачнём і ў той жа час паўторым складаныя сказы, якія вы ўжо называлі на пачатку ўрока: складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя. На палосках паперы напісаны сказы, вы павінны прачытаць сказ услых, вызначыць яго від, выйсці да дошкі і прымацаваць да адпаведнага лістка з назвай складанага сказа.

Складаныя сказы:

А восень звоніць у звон свой медны, і вецер трубіць у доўгі рог (Складаназлучаны). Ці то сонца свеціць, ці то месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна (Складаназлучаны). Мне рукі азяблыя полымя грэла, а роднае слова сагрэла душу (Складаназлучаны). Сон мяне зморвае толькі на світанні, калі пачынаюць ужо добра шарэць вокны (Складаназалежны). Усё ў тую раніцу спрыяла таму, каб мы з табой сустрэліся (Складаназалежны). Каб прывабіць буслоў, гаспадар зацягвае на дрэва старую барану (Складаназалежны). Пасля адлігі закруціў мароз, ударыла ў сцены завіруха (Бяззлучнікавы). Мы знаем: у нашай краіне няма непрыгожай зямлі (Бяззлучнікавы). Заспявае жаўрук – вясна адгукаецца ў сэрцы гулам (Бяззлучнікавы). Вясна мінецца – прыйдзе лета (Бяззлучнікавы).

4. "Аднаві прыказку" (праца ў групе)

Пераблытаны часткі прыказак. Знайдзіце пачатак і канец кожнай з іх. Выкажыце сваё разуменне прыказкі, абгрунтуйце пастаноўку двукроп'я:

*1. Не плюй у вадзіцу: ... 2. Ажаніцца – не ўпасці: ... 3. Чорт чорту спавядаўся: ... 4. Да пары збан ваду носіць: ... 5. Мая справа цялячая: ...*

Даведка: пад'еў ды ў хлеў; адзін мігнуў, другі дагадаўся; вушка адарвецца – збан паб'ецца; не ўстанеш, не атрасешся; згадзіцца напіцца.

Заданне павышанай складанасці: перакласці прыказкі і прымаўкі на беларускую мову, паставіць правільна ў іх знакі прыпынку.

Не научат родители научит горе. Тучи не будет гром не ударит. Уважай отца с матерью других не найдёшь. Зайца ноги носят волка зубы кормят лису хвост бережёт.

Адказы:

Не научат родители научит горе. Не навучаць бацькі – навучыць гора.

Тучи не будет гром не ударит. Хмары не будзе – гром не ўдарыць.

Уважай отца с матерью других не найдёшь. Шануй бацьку з маткай: другіх не знойдзеш.

Зайца ноги носят волка зубы кормят лису хвост бережёт. Зайца ногі носяць, воўка зубы кормяць, лісу хвост беражэ.

5. Праца на картках (перабудова сказаў). Праца ў парах.

– Вам неабходна перабудаваць складаназалежныя сказы ў бяззлучнікавыя. Назваць знакі прыпынку на мяжы частак.

*Перабудуйце складаназалежныя сказы ў бяззлучнікавыя. Пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх.*

1. Размова была простая і шчырая, бо яна ішла ад сэрца. (Я. Колас)

2. Я чую, як палае кроў ад іскры першай бліскавіцы... (М. Танк)

Растлумачыць значэнне слова "бліскавіца".

**5. Кантрольна-рэфлексійны этап**

6. Тэставая работа. Кожны вучань працуе ў сваім сшытку, пасля выканання работы вучні абменьваюцца сшыткамі і разам з настаўнікам правяраюць адказы, выстаўляюць адзнакі: 1 бал за кожны правільны адказ. На работу

10–11 хвілін, 1 хвіліна на 1 заданне, некалькі правільных варыянтаў адказу.

Тэставая работа да тэмы
"Складаныя бяззлучнікавыя сказы".

1. Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы:

а) За гаем сонца патухае, з-за гор выходзіць маладзік.

б) Па балоце ісці было цяжка: багна амаль не замярзала і на зіму.

в) Ён выходзіў на ганак і дабрадушна ўглядаўся ў сына паверх акуляраў, затым хуткім рухам рукі скідаў акуляры, усміхаючыся, сыходзіў з ганка і абдымаў сына.

г) А жуbecause журавель крычаў, кідаў у ветраны прастор дарэмныя гукі трывогі, махаў і махаў аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай шыяй, але дагнаць чараду не мог.

2. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:

а) Доўга не мог заснуць Міхась, клапатлівыя думкі змянялі адна адну.

б) Першы марозік моцна скаваў зямлю – у паветры кружацца рэдкія сняжынкі.

в) Даволі часта трапляюцца старыя асушальныя каналы; яны заплывалі тванню і зараслі плывунамі.

г) Вясёлка над Дзвіной паднялася ўгару, колеры яе пабляклі і неўзабаве рассеяліся зусім.

3. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць двукроп'е:

а) У маленькім садку было надзвычай хораша … белапенная квецень аздобіла кожнае дрэўца.

б) Вучаць, выхоўваюць не падручнікі … вучыць, выхоўвае настаўнік.

в) Машына са збожжам бяжыць, вецер разносіць над светам … у нас … з айздроснае лета, у нас … багатае лета.

г) З правага боку альтанкі цягнуліся руіны старога замка … яшчэ ніжэй ляжала паўкругам вялікая даліна.

4. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць працяжнік:

а) Алесь зразумеў … нервовасць Кастуся можа сапсаваць справу.

б) Вецер загуляе … хвойнік, лозы гнуцца.

в) Не туман на рацэ плыве … прыдрамалі ў цясніне аблокі.

г) Любіце працу … у ёй найбольшы смак жыцця.

5. Адзначце сказы з разнатыпнымі часткамі:

а) Адзін раз зманіш – другі раз не павераць.

б) Розум будзе – прыйдзе шчасце.

в) Нож тупы – гаспадар скупы.

г) Зла не кліч – яно само прыйдзе.

6. Адзначце сказы з пунктуацыйнымі памылкамі:

а) Адчыніў Сымонка дзверы і адразу крок спыніў: такой чыстае кватэры ён не бачыў і не сніў.

б) Чалавек крычаў – зямля маўчала.

в) Шумелі вербы над вадою: з-за хмараў месяц выплываў.

г) Ціха было ў навакольных лясах, супакоілася птаства, не шапацелі дрэвы.

7. Выберыце знак прыпынку, які неабходна паставіць на месцы пропуску, і ўмову яго пастаноўкі. Адзначце нумар правільнага адказу:

*Радасна віталі новы дзень птушкі … звінелі ў вышыні жаваранкі, мітусіліся каля шпакоўні ў садзе шпакі, няспынна лёталі імклівыя ластаўкі.*

а) Коска, таму што часткі бяззлучнікавага складанага сказа маюць інтанацыю пералічэння.

б) Двукроп'е, таму што ў першай частцы называецца прычына таго, пра што гаворыцца ў другой частцы.

в) Працяжнік, таму што змест дзвюх частак супрацьпастаўляецца.

г) Двукроп'е, таму што другая частка раскрывае, удакладняе, дапаўняе змест першай.

8. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

а) Вось ужо гром грукоча над самай галавой … маланка зіхаціць безупынна … вецер хістае дрэвы.

б) Вось і збылася мая запаветная мара … мне далі кватэру!

в) Якраз прыпала свята вызвалення … усюды сцягі, зелень, кветкі, музыка, людзі з ордэнамі, медалямі на грудзях.

г) Вечар сыходзіць на вялізны горад … моцны вецер, ідучы з узмор'я, запаўняе вуліцы і плошчы, кружыць у глухіх дварах, над адталымі гурбамі.

9. Адзначце схему, якая адпавядае сказу. Знакі прыпынку не пастаўлены:

*Кранеш галінку … мокрая гронка язміну асыпаецца пялёсткавым дажджом.*

а) [ ], [ ].

б) [ ]: [прычына].

в) [ ] – [час,умова].

г) [ ] – [вынік,вывад].

10. Устанавіце адпаведнасць. Якія знакі прыпынку патрэбна паставіць у наступных сказах? Адказ запішыце ў выглядзе пры, напрыклад, А-4:

| | |
|---|---|
| А. Трапіць у лодку вада … сапсуецца відэакамера. | 1. Коска |
| Б. Нам пашанцавала … гаспадары былі дома. | 2. Кропка з коскай |
| В. Чалавек плануе … жыццё ўносіць праўкі ў яго планы. | 3. Працяжнік |
| Г. Елкі цёмнагрывыя намоклі … сушаць вербы пасмы жоўтых кос. | 4. Двукроп'е |

Адказы:

| Нумар задання | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Правільны адказ | а,б | в,г | а,в | б,в | а,б | в,г | г | а,г | в | А-3<br>Б-4<br>В3<br>Г-1 |

– Выстаўце бал за работу ў ліст кантролю. Колькі правільна выкананых заданняў, столькі і балаў. У лісце кантролю ў вас ужо ёсць тры адзнакі. Выстаўце, калі ласка, падагульняючую адзнаку.

**6. Падвядзенне вынікаў. Выстаўленне адзнак**

– А зараз мы падвядзём вынікі вашай работы на ўроку.

– Якую тэму мы сёння паўтаралі?

– Якія знакі прыпынку ставяцца ў бяззлучнікавым складаным сказе?

(Адзнакі выстаўляюцца з улікам лічбавага дыктанта на пачатку ўрока, тэставай работы, а таксама ўлічваецца, як вучань працаваў на працягу ўсяго ўрока.) Кожны вучань устае і каменціруе сваю адзнаку, настаўнік уносіць свае прапановы. Вучні пачынаюць выстаўленне адзнак

Я паставіў(ла) б сабе адзнаку…, бо…

–Ці супалі вашы адзнакі, якія вы выставілі ў пачатку і ў канцы ўрока?

**7. Рэфлексія**

– Ацаніце ваш настрой на ўроку ў балах (ад 1 да 10). Чым вышэй ваш настрой, тым вышэй і бал, выберыце сэрца такога колеру, які вам падабаецца, пастаўце бал у сэрцы і прымацуйце сэрца да дошкі.

**8. Дамашняе заданне**

Запісаць 10 прыказак, структурна арганізаваных як бяззлучнікавыя складаныя сказы.

На 10 балаў – Скласці міні-сачыненне па тэме “Мая будучая прафесія” (з выкарыстаннем бяззлучнікавых сказаў).

На 10 балаў – Скласці кластар на тэму “Бяззлучнікавыя складаныя сказы”.




**Падзяка за працу на ўроку**

**ДАДАТАК**

**Прыклад кластара па тэме “Бяззлучнікавыя складаныя сказы”**

